Аддзел бібліятэчнага маркетынгу
ДУК “Шчучынская раённая бібліятэка імя Цёткі”

# Абласныя і раённыя конкурсы і акцыі

Шчучын, 2023

## Абласны конкурс на лепшую віртуальную віктарыну, інтэрактыўную гульню, анлайн-крыжаванку “Бібліятэка.Ьу”

Конкурс праводзіца з мэтай актывізацыі работы публічных бібліятэк па стварэнні ўласных электронных інфармацыйных рэсурсаў, пашырэння іх асартыменту і павышэння якасці электронных паслуг; удасканалення і папулярызацыі ўласных сайтаў, старонак у сацыяльных сетках, павелічэння колькасці віртуальных зваротаў карыстальнікаў бібліятэк.

Удзельнікі павінны распрацаваць і прадставіць на ўласных сайтах і ў сацыяльных сетках інфармацыйна-забаўляльныя рэсурсы: віртуальную віктарыну, інтэрактыўную гульню, анлайн-крыжаванку.

Конкурс праводзіцца з 1 лютага па 17 красавіка.

## Раённы конкурс на лепшую самаробную кнігу “Книжные сокровища”

Конкурс праводзіцца з мэтай далучэння насельніцтва да чытання праз творчы падыход для стварэння і афармлення самаробных выданняў. У межах конкурса неабходна стварыць самаробную рукапісную кнігу. Кнігі могуць быць выраблены як у традыцыйным фармаце, так і ў выглядзе кніг з

інтэрактыўнымі элементамі - гульню, раскладванне, размалёўванне і інш.

Конкурс разлічаны на тэрмін з 9 студзеня да 10 верасня 2023 года.

## Раённы фотаконкурс "Нашы чытачы ў аб'ектыве"

Конкурс праводзіцца з мэтай павышэння статусу кнігі і чытання сярод жыхароў Шчучынскага раёна; развіцця і падтрымкі ў дзяцей і падлеткаў звычкі да чытання, прыцягненне новых чытачоў у бібліятэку; падтрымка творчых форм далучэння да чытання. Для ўдзелу ў конкурсе неабходна зрабіць мастацкія фатаграфіі любога жанру па тэматыцы «сэлфі і кніга», гэта значыць фатаграфія павінна быць сюжэтна звязана з любой праявай працэсу чытання жыхароў раёна.

Конкурс праводзіцца па наступных намінацыях:
- "Кніга ў сямейным коле";
-"Чытач бібліятэкі" (фатаграфія каля бібліятэчнага стэлажа або выстаўкі);
- "Самы крэатыўны чытач" (чытанне ў нечаканых месцах, у незвычайнай абстаноўцы).

Конкурс праходзіць з 3 студзеня па 31 мая 2023 года.

## Раённы конкурс на лепшае крэатыўнае мерапрыемства "Пісьменнікі-юбіляры 2023"

Конкурс праводзіцца з мэтай садзейнічання прыцягненню ў бібліятэку чытацкай аўдыторыі рознаўзроставых катэгорый, актывізацыі чытацкай цікавасці карыстальнікаў да кнігі і бібліятэкі і ўкараненне нетрадыцыйных форм работы.

У межах конкурсу неабходна правесці крэатыўнае масавае мерапрыемства (форма і тэма мерапрыемства можа быць разнастайная).

Конкурс праходзіць з 3 студзеня па 1 лістапада.

## Раённая акцыя
## "Мір, спакой, незалежнасць"
*(да Года міру і стварэння)*

Акцыя праводзіцца з мэтай выхавання патрыятызму, пачуцця салідарнасці, датычнасці да падзей, якія адбываюцца ў свеце, выхавання пачуцця патрыятызму на аснове захавання культурна-гістарычнай спадчыны, вывучэнне гісторыі свайго краю, знаёмства з яго гістарычным мінулым і сучасным жыццём.

Этапы правядзення:

- Збор матэрыялаў для стварэння базы дадзеных "Гісторыя і ўспаміны": стварэнне краязнаўчага падкаста, успаміны мясцовых жыхароў пра гісторыю роднага краю, традыцыі + напісанне летапісу населенага пункта, збор краязнаўчых матэрыялаў (з 03.01.2023 г. па 01.07.2023 г.).

- Стварэнне на сайце раённай бібліятэцы базы дадзеных “Гісторыя і ўспаміны” (верасень).
- Арганізацыя і правядзенне розных мерапрыемстваў, прысвечаных Году міру і стварэння (сістэматычна).

Акцыя праводзіцца з 03.01.2023 г. па 30.11.2023 г.

**Раённыя акцыі:**

- Літаратурныя чытанні “Пра мову – з любоўю і павагай” (да Міжнароднага дня роднай мовы);
- Акцыя памяці “Хатынь: символ вечной памяти и скорби белорусского народа” (сакавік);
- “Краіна чытаючага дзяцінства” (на працягу тыдня дзіцячай кнігі);
- Летняе фотаімгненне з кнігай (на працягу лета).